*Лявояаеа П.І.*
*Беларускі дзяржауны ўніверсітэт, Мінск*

# ЛІТАРАТУРНАЯ АДУКАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ-КУЛЬТУРОЛАГАЎ: РЭФЛЕКСІЯ ПЕДАГАГІЧНАГА ВОПЫТУ

Літаратура - найважнейшая складовая частка мастацкай культуры, а беларускую літаратуру можна лічыць падмуркам асэнсавання студэнтамі-культуролагамі нацыянальнага менталітэту суайчыннікаў як у сучаснасці, так і на папярэдніх этапах развіцця нашай гісторыі і культуры. Наогул, літаратура ўяўляе сабой культурную ўніверсалію як культурны ідэал і ўзор і як ужо здзейсненая ў канкрэтнай і адэкватнай мастацкай форме каштоўнасць мастацтва. Гэта і асобая форма пазнання свету і чалавека. Прытым не фармальна-лагічнага пазнання, а сінтэзаваных. закончаных ведаў з уласным крытэрыем ісціны, бо толькі мастацтва здольнае "эксперыментавць'" з культурай як з цэласным тыпам чалавечых адносін да рэчаіснасці, асэнсавана абнаўляць і паўтараць альтэрнатывы жыцця. Нарэшце, літаратура выступае як форма і спосаб духоўных зносін, што ў свой час сцвярджаў Л. Талстой і што атрымала навуковае абгрунтаванне ў працах М. Бахціна. Духоўныя зносіны - гэта інструмент культуры, прызначаны для выхавання чалавека: яго каштоўнаснай сферы, светапогляду, адносін да людзей і да самога сябе. Асобасныя сэнсы выпрацоўваюцца чалавекам самастойна, а не перадаюцца яму разам з інфармацыяй, выспяваюць на аснове ўласных перажыванняў, а не транслююцца чыста рацыянальным спосабам.

Літаратурная адукацыя студэнта-культуролага як частка агульнай гуманітарнай адукацыі і спецыяльных ведаў і ўменняў спалучае ў сабе ўніверсаліі літаратуры, мовы, на якой яна створана, адукацыі ды нават самой культуры. Да таге ж, яна ўяўляе сабой неабходную ўмову фарміравання нацыянальнай самасвядомасці моладзі, выступае паказчыкам узроўню культурнасці асобы. 3 усяго сказанага вьшікае, што родная літаратура ў гуманітарнай адукацыі беларускіх студэнтаў-культуролагаў павінна займаць вядучае месца, бо літаратурная спадчына як арганічная частка нацыянальнай культуры дапамагае ім глыбей спазнаць дух народа, уключыць мастацкія багацці мінулага ў свой духоўны актыў, зрабіць іх фактам сучаснага культурна-

гістарычнага працэсу. Каб усвядоміць багацце і разнастайнасць гісторыка-літаратурнага працэсу, які пачаўся ў XI ст. і працягваецца сёння, каб навучыцца з эстэтычнага боку аналізаваць і ацэньваць найбольш значныя мастацкія творы беларускай паэзіі, прозы і драматургі, безумоўна, патрабуецца значна больш часу, чым адзін семестр. А менавіта такі час, а канкрэтней, усяго 30 лекцыйных і 6 практичных гадзін прадугледжвае праграма на вывучэнне як даўняй, так і новай ды навейшай беларускай літаратуры. Пры гэтым кантроль ведаў абмяжоўваецца толькі залікам, а нават не экзаменам, няма і так званых КСР. Да таго ж, курс "Псторыя беларускай літаратуры" не існуе як асобная самастойная гуманітарная вучэбная дысцыпліна. Ён складае толькі частку курса "Сусветная і беларуская літаратура" пры раскладзе гадзін: 82 и 30, г. зн. сусветная літаратура вывучаецца на працягу трох семестраў, пачынаючы з першага курса. Беларуская літаратура падключаецца толькі ў трэцім семестры, разглядаецца паскорана і выглядае пэўным давескам да замежных. Ці варта тлумачыць, якую "карысць" нясе з сабой такое становішча для нацыяналъна-арыентаванай гуманітарнай адукацыі студэнтаў-культурологаў? Шмат праблем узнікае і для выкладчыка, які не хоча губляць свой прафесіяналізм, педагагічнае і чалавечае сумленне, які імкнецца не проста пазнаёміць студэнтаў з асаблівасцямі гісторыка-літаратурнага працэсу на Беларусі, а выхоўваць у студэнтаў патрыятызм, чалавечнасць. маральнасць, талерантнасць і іншыя якасці нацыянальнага характару, а таксама развіваць мастацкі густ і творчае мысленне студэнтаў, далучаць іх да навукова-даследчага пошуку. Паўстае няпростае пытанне, як гэтага можна дасягнуць пры 15-ці сустрэчах са студэнтамі на лекцыях і трох на практычных занятках, якія праводзяцца з усім патокам. Асаблівасці вывучэння роднай літаратуры студэнтамі-культуролагамі былі ўжо вызначаны і ахарактарызаваны намі ў артыкуле з адпаведнай назвай. Сцісла нагадаем толькі пра тыя з іх, якія дазваляюць выкладчыку пэўным чынам эканоміць вучэбны час. Па-першае, гэта спалучэнне традыцыйнага лекцыйна-семінарскага шляху прад'яўлення ведаў з сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі. метадамі або прыёмамі. Адзін з важнейшых спосабаў дзейнасці выкладчыка - гэта арганізацыя сістэматычна кантралюемай самастойнай чытацкай дзейнасці студэнтаў, што патрабуе ад яго не толькі прафесійнай кампетэнтнасці, але і псіхалагічных намаганняў, цярплівасці, затрат асабістага часу (кантроль за самастойным чытаннем студэнтамі мастацкіх тэкстаў не прадугледжваецца вучэбнай нагрузкай педагога), устанаўлення паважтіва-даверлівых адносін з кожным чытачом-студэнтам. Трэці сродак актывізацыі чытацкай дзейнасці - гэта

міжпрадметныя сувязі, пастаяннае ўзгадванне выкладчыкам ведаў, набытых студэнтамі папярэдне, абуджэнне ўяўленняў, атрыманых на занятках па міфалогіі, гісторыі культуры, пры вывучэнні бібліі, замежнай літаратуры. выяўленчага мастацтва і іншых гуманітарных дысцыплін. Сістэматычная прэзентацыя на лекцыйных і практычных занятках выданняў знакамітых беларускіх аўтараў, разгляд студэнтамі анталогій, хрэстаматый, энцыклапедый, даведнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў, артыкулаў з перыёдыкі, рэпрадукцый карцін або твораў кніжнай графікі, створаных беларускімі мастакамі на літаратурныя тэмы, камп'ютэрнай прэзентацыі неабходных матэрыялаў таксама дапамагае зацікавіць аўдыторыю пэўным аўтарам, творам, сюжэтам, мастацкім стылем або праблемаю. На вялікі жаль, з сеткі навучальных дысцыплін зняты спецкурс "Аналіз мастацкага тэксту". які даваў вялікія мажлівасці для далучэння студэнтаў да слоўнага мастацтва, для выпрацоўкі іх мастацкага густу ў працэсе супрацоўніцтва з выкладчыкам на практычных занятках. Тады адбывалася асобаснае асваенне студэнтамі маральна-эстэтычных каштоўнасцей нашага народа шляхам перачытвання і паступовага асэнсавання цэласнага мастацкага тэксту, прасякнутага думкамі і перажываннямі пісьменніка, яго мастацкім замыслам, які выяўляецца ў адметнасці сюжэта. жанру, вобразаў, моўных сродкаў, вершаванага або празаічнага маўлення. Інакш кажучы, у дыялогу з пісьменнікам і выкладчьпсам, які разам са студэнтамі шукаў глыбінныя сэнсы тэкстаў, паказваў магчымасць розных яго інтэрпрэтацый, нараджаліся жывыя, а не фармальныя веды студэнтаў. Нават памылкі, неразуменне тых, хто выказваўся (у вуснай ці пісьмовай форме), мелі прадуктыўны характар, бо выклікалі сумненні, разважанні, дыскусію і сведчылі тым самым пра свабодны акт творчага ўяўлення асобы, пра ўменне ўтрымліваць у свядомасці супрацьлеглыя думкі, не губляючы пры гэтым здольнасці паглыбляць або супрацьпастаўляць іх. Пры сённяшнім паскораным вывучэнні беларускага слоўнага мастацтва такія магчымасці згублены. Застаецца яшчэ надзея паўплываць на гуманітарнае мысленне і гуманістычны светапогляд студэнтаў праз кіраўніцтва іх курсавымі або дыпломнымі працамі. Але, на жаль, беларускую тэматыку выбіраюць толькі адзінкі. І гэта не дзіўна, калі ўлічыць стан беларускай мовы ў сучасным грамадстве, а значыць, проста ўзровень пісьменнасці студэнтаў. Нават на лекцыях можна заўважыць. што нямала высілкаў шмат хто з іх прыкладае для таго, каб зразумець сэнс таго, што гаворыць выкладчык, а яшчэ ж неабходна ўсвядоміць цэласны змест пэўнага фрагмента выказвання, суаднесці з тым, што гаварылася раней, паспець запісаць галоўнае, так што эстэтычныя ўражанні і меркаванні

шмат каго з культуролагаў адыходзяць на другі план, хаця павінны быць на першым. У такім выпадку выратавальным сродкам уваходжання ў мастацкую сістэму твораў таго ці іншага аўтара становіцца самастойнае чытанне яго тэкстаў і абавязковы гіісьмовы запіс уласнай ацэнкі ці тэзісаў зместу на беларускай мове, няхай сабе спачатку з памылкамі, затое з сваімі асабістымі абагульненнямі, каштоўнасць якіх для літаратурнай адукацы ды развіцця нацыянальнай самасвядомасці студэнта-культуролага не заменяць ніякія літарагуразнаўча-крытычныя трактаты. Апроч таго, сістэматычныя запісы ў чытацкім дзённіку развіваюць і ўмацоўваюць пісьмовае маўленне студэнта, а як вядома, валоданне мовай прадугледжвае непарыўную сувязь слухання, чьггання, пісьмовага і вуснага маўлення. На іх вуснае маўленне амаль не застаецца часу, застаецца слухане, чытанне, пісьмовае маўленне. Да таго ж ва ўмовах дэфіцыту вучэбнага часу пастаянны кантроль выкладчыка за станам запісаў у чытацкіх дзённіках становіцца таксама дзейсным сродкам ацэнкі паспяховасці вывучэння культуролагамі роднай літаратуры.

Такім чынам, літаратурная адукацыя студэнтаў-культуролоагаў уключае ў сябе не толькі тое, што вывучаецца ў ВНУ. Яна мае грунтоўны падмурак - тое. што закладзена ў дзяцінстве і што дала адукацыя школьная. Існуе надзея, што крэатыўная моладзь не спыніцца на дасягнутым, а будзе працягваць чытаць кнігі, не абмяжуецца толькі візуальнымі сродкамі атрымання інфармацыі. Так што цікаўнасць да мастацкай літаратуры, закладзеная выкладчыкамі ВНУ, магчыма, будзе мець працяг. Маецца на ўвазе не толькі беларуская літаратура, але і сусветная, і Біблія як кніга кніг, як код еўрапейскай культуры.

Літаратурная адукацыя студэнтаў-культуролагаў, на нашу думку, зусім не перашкаджае культуралагічнай, а толькі падмацоўвае яе шматлікімі прыкладамі асабістых лёсаў творцаў-пісьменнікаў і іх герояў. Праз эстэтычнае, праз перажыванне студэнтамі Красы або праз расчараванне ад яе адсутнасщ выводзіць іх да маральных высноў. І заўсёды яны звязаныя з лёсам асобы, з індывідуальнай адказнасцю чалавека, з яго сумленнем. А гэта надзвычай важна ў сучасным прагматычным свеце, калі, кажучы словамі знакамітага літаратуразнаўцы і педагога М. Тычыны. губляюцца простыя, адвечныя і разам з тым глыбінныя асновы чалавечага існавання. Асэнсаванне базавых чалавечых каштоўнасцей выявіла беларуская літаратура XX ст., пачынаючы з Купалы, Коласа, Багдановіча, Гарэцкага, Чорнага, Мележа, Брыля, Быкава, Адамовіча, Казько. Усё, што сусветная літаратурная традыцыя з часоў класіцызма і рамантызма лічыла

малавартасным у эстэтычных адносінах, наша прыгожае пісьменства апаэтызавала, узвялічыла. узвяла на ўзровень эстэтыкі. Нацыянальнай літаратурнай традыцыяй стаў таксама паказ жыцця ў экстрэмальных умовах XX ст. [1, с. 374]. У такой літаратурнай традыцыі захоўваецца вялікі духоўны патэнцыял, на жаль, недаацэнены сусветнай мастацкай свядомасцю, але пастунова ўсведамляемы студэнтамі-культуролагамі. Працэс вывучэння імі айчыннай літаратуры важны не толькі ў эстэтычных адносінах, але і ў адукацыйных, бо дазваляе ажыццяўляць пераход ад традыцыйнага да суб'ект-суб'ектнага навучання, якое прафесар І. В. Марозаў назваў рэфлексійнай ці герменеўтычнай парадыгмай. Сутнасць яе ў тым, што веды не завучваюцца-запамінаюцца, а перажываюцца-асэнсоўваюцца. Літаратурная адукацыя грунтуецца на такой парадыгме і патрабуе ад выкладчыка яе шырокага выкарыстання.

Адзначым яшчэ адзін тэзіс на карысць нацыянальна-арыентаванай літаратурнай адукацыі: мову ратуе літаратура. Дазволім сабе спаслацца на меркаванне сучаснага паэта і перакладчыка І. Шклярэўскага: "Літаратура трымаецца за слова, але яна ж і ратуе мову... Мову нельга выратаваць аніякімі ўказамі, яе нельга адгарадзіць ад другіх агрэсіўных моваў аніякімі шлагбаўмамі, яе можна выратаваць толькі знутры - прыгажосцю слова, радка, гучання. Калі на мове пішуцца шэдэўры. яна набірае сілу... Выжывае мова толькі разам з літаратурай. Толькі разам з паэзіяй як самым высокім і вытанчаным відам літаратуры. Калі літаратуру аддзяліць ад мовы, атрымаецца мова спажыўцоў, мова прадпрымальнікаў..." [2, с. 319]. І далей зусім слушна мастак адзначае, што такой катэгорыі грамадства ўсё роўна, якая мова ў краіне, бо ў іх адна мова - грошы. Вядома ж мы, выкладчыкі, імкнемся да таго, каб нашы выпускнікі-культуролагі разумелі, што мова - гэта яшчэ і радзіма, мова - гэта дзяржава, гэта яе самастойнасць.

## ЛІТАРАТУРА

1. Тычына, М. Анкета канферэнцыі / М. Тычына // Война в славянской литературе / сост. И. Н. Афанасьев. - Мозырь: ООО ИД "Белый ветер", 2006. - С. 373-375.
2. "Мову ратуе - літаратура". Гутарка Міхася Скоблы з Ігарам Шклярэўскім. Дзеяслоў,2012,№5 (60). С. 315-325.